УДК 378 (06)

# ЯН АМОС КОМЕНСКІ: БЕЛАРУСКІ СЛЕД ЗНАКАМІТАГА ПЕДАГОГА

**В.У. Галубовіч, В.П. Галубовіч**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт» (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Анатацыя. У артыкуле прыведзены звесткі пра сувязі чэшскага вучонага-педагога Я.А. Коменскага з Беларуссю у 17 ст.
Ключавыя словы: педагогіка, рэлігія, палітыка, адукацыя.

# JAN AMOS KOMENSKY: THE BELARUSIAN TRACE OF THE FAMOUS TEACHER

**V.U. Halubovich, V.P. Halubovich**
EI «Grodno State Agrarian University» (Grodno, 230008, 28, Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)

Summary. The article presents information about the connections of the Czech scientist and teacher J.A. Komensky with Belarus in the 17th century.
Key words: pedagogy, religion, politics, education.

Імя педагога, філосафа і пансафіста Яна Амоса Коменскага (1592-1670 гг.) вядома кожнаму, хто так ці іначай меў знаёмства з гісторый і тэорыяй педагогікі. Агульнапрынятая аксіёма, што Я.А. Коменскі – адзін з бацькоў навукі пра выхаванне дзяцей. Знакаміты дзеяч чэскай і ўвогуле еўрапейскай культуры, ён быў вымушаны большую частку жыцця правесці за межамі сваёй Бацькаўшчыны па прычынах рэлігійнага і палітычнага пераследу. Коменскі, выдатны вучоны і выкладчык, не быў пасіўным сузіральнікам падзей свайго часу, але актыўна працаваў на карысць, у першую чаргу, чэшскай навукі і свайго народа, не змяняючы свайму рэлігійнаму выбару – прыналежнасці да пратэстанцкай царквы Чэшскіх братоў. У біяграфіі Коменскага асобны вялікі перыяд займае праца ў гімназіі ў польскім горадзе Лешна, дзе ён з перапынкамі выкладаў з 1625 г. па 1656 г., калі быў вымушаны разам з іншымі пратэстантамі эміграваць далей на Захад. Прычыны, якія прымусілі знакамітага вучонага ў гадах пачаць выратавальную вандроўку былі празаічнымі: ён, як і іншыя пратэстанты, вітаў прыход у 1655 г. у Польшчу шведскай арміі, пісаў панегірыкі ў гонар шведскага манарха і заклікаў палякаў да пераходу ў пратэстантызм. Спадзявацца на літасць ад католікаў, якія пачалі напрыканцы красавіка 1656 г. штурмаваць Лешна, ён не мог.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Менавіта рэлігійныя погляды і педагагічная дзейнасць Я.А. Каменскага з'яўляюцца тым ланцужком, які звязвае яго з Беларуссю, якая ў XVII ст. з'яўлялася часткай Вялікага Княства Літоўскага. Справа ў тым, што Коменскі знаходзіўся ў сталым кантакце са знакавымі постацямі ў пратэстанцкім руху ў ВКЛ, маторам якога была біржанская галіна рода Радзівілаў. У другой чвэрці XVII ст. біржанскія Радзівілы – Крыштап (1585-1640 гг.) і пазней яго сын Януш (1612-1655 гг.) – падтрымлівалі адносіны з Коменскім. Ведалі педагога і знакамітыя паплечнікі чэшскага пратэстанта. Да іх ліку адносіўся вядомы парламентарый Пётр Кахлеўскі, бліжэйшы супрацоўнік Радзівілаў-кальвіністаў. Род Кахлеўскіх меў нямецкае паходжанне, але паступова спольшчыўся, а сам Пётр Кахлеўскі апынуўся ў Беларусі толькі ў 1620-я гады. Яго палітычная і ўрадніцкая кар'ера была звязана з Брэсцкім паветам, які ён прадстаўляў на соймах Рэчы Паспалітай. Сувязі з Радзівіламі, асабісты аўтарытэт сярод берасцейскіх абывацеляў і працаздольнасць дазволілі Кахлеўскаму у 1635 г. стаць павятовым войскім, а з 1638 г. узначаліць Брэсцкі земскі суд. З'яўляючыся не толькі па службе, але і ідэйна адданым свайму патрону (Крыштапу Радзівілу) Кахлеўскі выяўляў сапраўдную рэлігійную жарсць. Праявай гэтага была фундацыя пратэстанцкай царквы (збору) у Нурцы.

З'яўляючыся асобай добра адукаванай у галіне літаратуры, гісторыі і права, Кахлеўскі паспяваў сачыць за найноўшымі трэндамі ў гуманітарнай навуцы, у тым ліку захапіўся дыдактыкай Я.А. Коменскага. Паміж чэшскім вучоным і палітыкам-пратэстантам з ВКЛ усталяваліся шчыльныя кантакты, больш таго, Кахлеўскі выступаў у якасці пасрэдніка паміж Коменскім і Радзівіламі. Адносіны дайшлі да таго, што Кахлеўскі аддаў свайго старэйшага сына Амброзія Хрысціяна пад апеку і ў навучанне чэшскаму педагогу. Відавочна, Амброзі Хрысціян з'яўляўся вучням Коменскага падчас знаходжання апошняга ў Эльблонгу. Там Коменскі пражываў у 1642-1648 гг., выкладаў у гімназіі і даваў прыватныя ўрокі. Пад апекай настаўніка сын Кахлеўскага заставаўся да чэрвеня 1645 г., пасля чаго павінен быў выехаць на навучанне за мяжу. Пётр Кахлеўскі выяўляў вялікі клопат адносна адукацыі Амброзія, якому выпадала рэалізаваць шмат задум бацькі: стаць святаром, вярнуцца ў ВКЛ і служыць пры двары Радзівілаў, займацца публічнай дзейнасцю. Ужо ў гэты час ён аддае сыну частку сваіх уладанняў для забеспячэння навучання.

Лёс, аднак, вырашыў іначай, і планы П. Кахлеўскага не былі рэалізаваныя. З пачатку 1640-х гадоў ён моцна захварэў і паволі стаў адыходзіць ад актыўнага палітычнага жыцця. Перад смерцю у 1646 г. П. Кахлеўскі складае тастамент (дарэчы, так атрымалася, што і акт

апошняй волі гэтага дзеяча захаваўся ў Беларусі ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродна), дзе размяркоўвае сваю маёмасць. Сярод шасці дзяцей на першым месцы быў згаданы Амброзі, якому дастаўся знакавае ўладанне Нурэц (дзе размяшчалася родавая фундацыя, г. зн. пратэстанцкі збор) і Тэлятыцкія фальваркі. Акрамя таго, ён аддаў сынам сваю бібліятэку, частка якой павінна была адыйсці старэйшаму сыну. Ад некаторай сумеснай уласнасці, правы на якую сыны Кахлеўскага, у тым ліку і Амброзі, атрымалі ў спадчыну яны пачалі пазбаўляцца ўжо ў 1646 г. Так, аддаленыя ўладанні ў Полацкім ваяводстве (Рабшчызна ў Невельскім стане) 4 лістапада 1646 г. Кахлеўскія (у тым ліку Амброзі) збылі каралеўскаму сакратару Балтазару Дароўскаму. Але неўзабаве пасля смерці П. Кахлеўскага, у 1647 г., памірае і яго старэйшы сын.

На жаль, так здараецца ў чалавечым жыцці, што лепшая інвестыцыя, інвестыцыя ў дзяцей не заўсёды спраўджваецца. Адбылося гэта і з П. Кахлеўскім, які свайго першынца аддаў у рукі лепшага педагога свайго часу. Аднак не ўсім наканаваны такі доўгі век як Я.А. Коменскаму, які пераджыў не аднаго свайго вучня, але пакінуў пасля сябе нешта большае – свае кнігі і ідэі, якія маюць іншы жыццёвы цыкл, чым кароткі век чалавека. Педагагічная спадчына Я.А. Коменскага, не гледзячы на яго рэлігійныя погляды і палітычныя памылкі, была запатрабаваная ў XVII-XVIII стст. у школьным навучанні на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, дзе у перакладзе выдавалі кнігі чэшскага педагога.

ЛІТАРАТУРА

1. Trawicka, Z. Działalność polityczna i reformacyjna Piotra Kochlewskiego // Odrodzenie i reformacja w Polsce. T. 8. 1963. S. 385-389.
2. Komeński Jan Amos // Polski słownik biograficzny. T. XIII. 1967-1968. S. 385-389.
3. Trawicka, Z. Piort Kochlewski / Z. Trawicka // Polski słownik biograficzny. T. XIII, 1967-1968. S. 216-217.
4. Śliż, N. Testament Piotra Kochlewskiego, sędziego ziemskiego brzeskiego z 1646 roku // Zapiski Historyczne. T. LXXII. R. 2007. Z. 1. S. 91-103.
5. НГАБ у Мінску. КМФ-18. В.1. Спр. 119. Арк. 628-628 адв.

УДК 378.091:378.014.61(476)

## АРТ-ТЕХНОЛОГИИ В ОБРАЗОВАНИИ

**Н.П. Ганчар**
ГУО «Гимназия № 9 им. Ф.П. Кириченко г. Гродно» (Республика Беларусь, 230026, г. Гродно, ул. Пестрака 34/1; e-mail: gancharnatalya@yandex.ru)

Аннотация. В статье проанализированы мнения исследователей и педагогов-практиков о сущности арт-технологий в образовании, формули-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ